Зацвярджаю
Намеснік Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
1.03.2023 А.У.Кадлубай

ПАЛАЖЭННЕ
аб рэспубліканскім творчым
конкурсе юных чытальнікаў
"Жывая класіка"

1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае мэты і задачы рэспубліканскага творчага конкурсу юных чытальнікаў "Жывая класіка" (далей – Конкурс).

1.2. Заснавальнікамі Конкурсу з'яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, ЗАТ "Сталічнае тэлебачанне".

2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ КОНКУРСУ

2.1. Конкурс праводзіцца ў мэтах: павышэння цікавасці дзяцей і падлеткаў да чытання; развіцця і захавання высокіх маральных каштоўнасцяў і ідэалаў беларускага грамадства; выхавання падрастаючага пакалення на лепшых узорах нацыянальнай літаратуры; прыцягнення ўвагі грамадскасці да праблематыкі чытання; пашырэння чытацкага кругагляду; пошуку і падтрымкі таленавітай моладзі.

2.2. Конкурс прысвечаны Году міра і стварэння.

3. ПАРАДАК І ЎМОВЫ ПРАВЯДЗЕННЯ КОНКУРСУ

3. Конкурс праводзіцца сярод навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі наступных узроставых груп: 1-4 класы ; 5-6 класы; 7-8 класы і 9-10 класы ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі і ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

3.1.Конкурс праводзіцца ў пяць этапаў:

- першы этап праводзіцца з 22 лютага па 11 сакавіка 2023 года ва ўстановах агульнай сярэдняй і дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Колькасць удзельнікаў не абмяжоўваецца, пераможцы прымаюць удзел у раённым этапе Конкурсу;

- другі этап (раённы) – праводзіцца з 13 сакавіка па 28 красавіка 2023 года раённымі ўстановамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі. Пераможцы раённага этапу Конкурсу, заняўшыя першыя месцы ў кожнай ўзроставай групе, прымаюць удзел у абласным этапе Конкурсу;

- трэці этап (абласны (Мінскі гарадскі) – праводзіцца з 3 па 21 мая 2022 года абласнымі ўстановамі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і Мінскім гарадскім палацам дзяцей і моладзі.

Пераможцы абласнога (Мінскага гарадскога) этапу Конкурсу ў кожнай узроставай групе прымаюць удзел у паўфінале;

- чацвёрты этап (паўфінал) – праводзіцца з 1 па 15 чэрвеня 2023 года арганізатарамі Конкурсу. Пераможцы паўфіналу прымаюць удзел у фінальным этапе Конкурсу;

- пяты этап (фінал) – праводзіцца арганізатарамі Конкурсу ў рамках мерапрыемстваў Дня беларускага пісьменства.

3.2. На кожном этапе Конкурсу, акрамя фіналу, вызначаецца па аднаму пераможцу у кожнай узроставай катэгорыі.

4. ЖУРЫ КОНКУРСУ

4.1. У склад журы Конкурсу на ўсіх этапах ўваходзяць вядомыя дзеячы культуры і мастацтва, настаўнікі, бібліятэкары, пісьменнікі, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў.

4.2. Крытэрыі ацэнкі выступлення (паказчыкі – балы):

- глыбіня пранікнення ў вобраз і сэнс твора ад 0 да 10;
- выбар тэксту твора ад 0 да 10;
- артыстызм выканання ад 0 да 10;

максімальны бал 30.

5. УЗНАГАРОДЖАННЕ ПЕРАМОЖЦАЎ КОНКУРСУ

5.1. Усе ўдзельнікі фінала Конкурсу ўзнагароджваюцца дыпломамі лаўрэатаў Конкурсу, дыпломамі пераможцаў першай, другой і трэцяй ступеняў адпаведна і каштоўнымі падарункамі ад заснавальнікаў Конкурсу.

5.2. Пераможцы рэспубліканскага Конкурсу ўзнагароджваюцца пуцёўкай у Нацыянальны дзіцячы адукацыйна-аздараўленчы цэнтр "Зубронак".

6. ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ КОНКУРСУ

6.1. Этапы правядзення Конкурсу шырока асвятляюцца ў сродках масавай інфармацыі.

6.2. Інфармацыйнымі партнёрамі Конкурсу з'яўляюцца СМІ (па ўзгадненню з заснавальнікамі).

6.3. На працягу правядзення этапаў Конкурсу здымаюцца сюжэты і дэманструюцца ў эфіры нацыянальных і рэгіянальных тэлеканалаў. Тэлеверсія фіналу Конкурсу транслюецца асобнай праграмай у эфіры ЗАТ "Сталічнае тэлебачанне".

7. ФІНАНСАВАННЕ КОНКУРСУ

7.1. Фінансаванне Конкурсу забяспечваецца заснавальнікамі Конкурсу за кошт бюджэтных і пазабюджэтных сродкаў.

7.2. Могуць выкарыстоўвацца іншыя крыніцы фінансавання ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.